

# МЫ і ЧАС

ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА

№ 6 (266)
АЎТОРАК,
29 САКАВІКА
2016 ГОДА


**НАВІНЫ, ПАДЗЕІ, ФАКТЫ**

## НАШЫ Ў ЛІКУ ПЕРАМОЖЦАЎ

Не так даўно былі падведзены вынікі адкрытага абласнога конкурсу на атрыманне прэмій Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта таленавітым маладым вучоным і спецыялістам. У конкурсе прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх вышэйшых навучальных устаноў горада, а таксама Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Прыемна, што сярод пераможцаў – маладыя навукоўцы нашай ВНУ. У конкурсным раздзеле «Фундаментальныя даследаванні» прэміі атрымалі кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры літаратуры А.У. Крыклівец («Русская и белорусская проза второй половины XX века: сравнительно-типологический анализ») і доктар матэматычных навук, прафесар, дацэнт кафедры алгебры і методыкі выкладання матэматыкі М.М. Вараб'ёў («Алгебраические решетки классов конечных групп»).

## ПАЧАЛІСЯ ТЫДНІ ФАКУЛЬТЭТАЎ

Традыцыйна ўвесну ў нашай ВНУ праходзяць тыдні факультэтаў. Кожны факультэт ладзіць насычаную праграму, у якой прымаюць удзел выкладчыкі і студэнты. У межах тыдняў праходзяць дні адчыненых дзвярэй для абітурыентаў, дні здароўя, конкурсы насценгазет, круглыя сталы, майстар-класы і іншыя цікавыя мерапрыемствы.

## АКЦЫЯ ДА ДНЯ КАНСТЫТУЦЫІ

Да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь была праведзена гарадская акцыя «Праз дыялог моў – да душы, да сэрца». Напачатку перад прысутнымі выступілі артысты Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа з фрагментам спектакля «Конскі партрэт» і ўдзельнікі літаратурнай гасцёўні філалагічнага факультэта ўніверсітэта «Строкой негромкою…», якой, дарэчы, сёлета споўнілася 20 год. Але галоўнай падзеяй мерапрыемства стала правядзенне гарадскіх дыктовак па рускай і беларускай мовах, у якіх змаглі прыняць удзел усе ахвотныя. У выніку 38 чалавек пісалі дыктоўку па беларускай мове і 54 (у пераважнай большасці гэта студэнты факультэта навучання замежных грамадзян) – па рускай. З вынікамі дыктоўкі можна пазнаёміцца на сайце нашага ўніверсітэта.

## ПРАВЯЛІ МАЙСТАР-КЛАС

Падрыхтоўчае аддзяленне ВДУ імя П.М. Машэрава сумесна з аддзелам адукацыі, спорту і турызму Гарадоцкага райвыканкама на пачатку месяца на базе сярэдняй школы №1 правялі прафарыентацыйнае мерапрыемства для старшакласнікаў. Перад школьнікамі выступілі выкладчыкі і супрацоўнікі нашага ўніверсітэта, якія расказалі пра спецыяльнасці і факультэты нашай ВНУ і правялі майстар-класы на тэму «Аналіз тыповых памылак па цэнтралізаваным тэсціраванні».

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**

**У НУМАР**

# АТРЫМАЛІ ПЕРШАЕ ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА









Для студэнтаў-выпускнікоў надышоў самы адказны і хвалюючы момант – размеркаванне. Сёлета накіраванні на сваё першае месца працы атрымалі 385 студэнтаў дзённай формы навучання і 8 – завочнай. На ўсіх факультэтах размеркаванне прайшло паспяхова, практычна кожны студэнт ужо загадзя ведаў, дзе ён будзе адпрацоўваць два гады. Хтосьці знайшоў працу самастойна і прынёс імянны запыт, а камусьці працоўнае месца прапанавала камісія па размеркаванні. Таму ўсе студэнты ўпэўнена заходзілі ў аўдыторыю, бо ведалі: для іх месца працы знойдзена. Так было і на філалагічным факультэце, на якім пабывала наша рэдакцыя.

Канешне, нас найперш цікавіла размеркаванне студэнтаў спецыяльнасці «Беларуская філалогія», паколькі некаторыя з іх цесна супрацоўнічаюць з нашай газетай яшчэ з першага курса. Гэта Ганна Ціхачова, Андрэй Шчарбіцкі, Юлія Гаўрыленка, а таксама Тацццяна Васільева, Дзіяна Лось, Вераніка Радзько, Настасся Чартарыжская, Марына Драняева, Вераніка Шыпіла і інш. На жаль, не ўсе яны будуць працаваць у рэдакцыях газет, але спадзяёмся, што той вопыт, тыя практычныя навыкі і ўменні, якія яны набылі ў нашай рэдакцыі, спатрэбяцца ім у самастойным жыцці.

Вельмі радасна, што армію журналістаў папоўняць Андрэй Шчарбіцкі (рэдакцыя гарадской газеты «Віцьбічы»), Юля Гаўрыленка (рэдакцыя газеты Віцебскага раёна «Жыццё Прыдзвіння») і Вераніка Радзько (рэдакцыя газеты Лёзненскага раёна «Сцяг Перамогі»).

Мы верым, што, як бы ні склалася іх жыццё, дзе б ім ні прыйшлося працаваць і чым займацца, яны ніколі не забудуць універсітэт, у якім, як імгненне, праляцелі пяць год вучобы, а таксама нашу рэдакцыю, дзе хлопцы і дзяўчаты рабілі першыя творчыя крокі.

У добры шлях, выпускнікі!

**Фота і тэкст Алесі ДУБРОЎСКАЙ.**

**На здымку:** студэнты ФлФ падчас размеркавання.

**СТУДЕНЧЕСКОЕ ТВОРЧЕСТВО**

# ВСЕ КРАСКИ ФЕСТИВАЛЯ

Традиционно весной в университете проходит фестиваль художественного творчества студентов «Хит-парад». В этом году он в 15-й раз собрал самых креативных молодых людей, чтобы они продемонстрировали свои таланты и способности.

Посвящен «Хит-парад-2016» теме «Культура – сила традиций и творчества». И это неудивительно, ведь 2016 год в нашей стране объявлен Годом культуры.

На протяжении семи дней преподаватели и студенты будут свидетелями ярких, незабываемых программ, которые подготовили все факультеты вуза, а также Полоцкий и Оршанский колледжи. А на гала-концерте фестиваля будут названы имена лауреатов и дипломантов «Хит-парада».

Определить лучшие из представленных десяти конкурсных программ поможет компетентное жюри в составе: Владиславы Цвики, режиссера молодежного театра «Колесо», Андрея Голубя, директора Дома культуры Витебской государственной академии ветеринарной медицины, Айны Тюряковой, руководителя танцевального коллектива университета «Galaxy», Алексея Ващёнка, художественного руководителя Центра национальных культур ГУ «Центр культуры "Витебск"» и Максима Мухина-Гродницкого, председателя студсовета университета.

Согласно жеребьевке первым выступил один из самых многочисленных факультетов университета – факультет социальной педагогики и психологии.

Концепция его выступления заключалась в том, что современный человек много времени проводит в виртуальном мире, уходя от реальности. В течение жизни он накапливает «мусор» – в голове, в душе, в сердце. Решиться избавиться от него не так уж и просто. Только в конце выступления главный герой приходит к осознанию того, что реальная жизнь прекрасна и нужно ценить ее.

Вторыми в этот день на сцену вышли студенты биологического факультета. Своим выступлением они хотели сказать, что нужно мечтать и тогда мечты обязательно сбудутся.

Это был первый фестивальный день. Надеюсь, что впереди зрителей ждут не менее насыщенные и яркие концертные программы других факультетов.

Я же хочу пожелать всем участникам фестиваля победы, а зрителям – незабываемых впечатлений от юбилейного «Хит-парада».

**Анастасия БАЛТОВСКАЯ.**







**Фото Анастасии ЛАЗЕБНОЙ.**

**На снимках:** *(слева направо)* выступают студенты БФ; открывает фестиваль проректор по воспитательной работе И.В. Бондал; концертное выступление ФСПиП.

# «НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА»

***Паважаныя чытачы! Як вядома, сёлетні год аб'яўлены ў Рэспубліцы Беларусь Годам культуры. А паколькі культура пачынаецца з павагі і любові да свайго, роднага, то сёння мы хочам прапанаваць вашай увазе новую рубрыку «Нам засталася спадчына».***

***Спадчына – гэта наша багатая гісторыя, прыгожая бацькоўская зямля, самабытная народная культура, спрадвечныя духоўныя каштоўнасці, што ўзбагачаюць і натхняюць чалавека. Таму мы спадзяёмся, што зрабіць новую рубрыку цікавай, змястоўнай і разнастайнай нам дапамогуць не толькі студэнты, якія мараць сваё жыццё звязаць з журналістыкай, але і тыя хлопцы і дзяўчаты, хто неабыякава ставіцца да сваёй Бацькаўшчыны. Запрашаем таксама выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашай ВНУ распавесці пра сваю малую радзіму, пра таленавітых людзей, якія там сёння жывуць, пра абрады і традыцыі сваёй зямлі, што перадаюцца з пакалення ў пакаленне.***

***У нашай новай рубрыцы плануем таксама змяшчаць рэпартажы з тых мерапрыемстваў, якія будуць ладзіцца ў Год культуры. У гэтым нумары мы знаёмім вас з матэрыяламі, што падрыхтавалі студэнты і выкладчыкі гістарычнага і філалагічнага факультэтаў.***

# БУЧАНЫ – МАЯ РАДЗІМА




У Браслаўскім раёне, на самай мяжы з Літвой (раздзяляе нас і краіну-суседку толькі рака Дзісна), у мясцінах з надзвычай чыстай і першароднай прыродай знаходзіцца маленькая, але такая любая мне вёсачка Бучаны, дзе я нарадзілася і правяла свае дзяцінства. І сёння я хачу расказаць пра яе.

Вялікай вёска ніколі не была, але ў ёй заўсёды жылі вельмі працавітыя і шчырыя людзі. На жаль, тут не знойдзеш ні вядомых архітэктурных помнікаў, ні турыстычных стаянак. Але тут ёсць нешта большае, тое, што не ўбачыш вачыма, – гісторыя.

Кожны жыхар вёскі ведае, што назва Бучаны паходзіць ад старажытнай рыбацкай прылады – буча. Вядома таксама ўсім і легенда пра заснавальніка вёскі – літоўскага пана Бучыліса, які пабудаваў сабе ў нашых мясцінах невялікі палац.

У матэрыялах Александрыйскага гусарскага палка ёсць звесткі пра тое, што ў гады Першай сусветнай вайны каля Бучанаў праходзіла лінія фронту і ў вёсцы размяшчаўся 5-ы Данскі казацкі полк. Бітва паміж нямецкімі і рускімі салдатамі адбылася 14 верасня 1915 года і доўжылася да глыбокай ночы. Перамог тады нямецкі бок. Шмат забітых і параненых было пасля гэтага бою, нямала салдат патанула ў багне. Безліч зямлянак, акопаў і бліндажоў засталося каля нашай вёскі. У мірныя часы вяліся пошукі воінскіх захаванняў. Непадалёку былі знойдзены вялізны крыж, магіла карнета К.М. Бацюшкава і захаванні іншых гусар. Амаль усе салдаты былі ўзнагароджаны ордэнам Святога Велікамучаніка і Пераможаносца Георгія 4-й ступені. Вызначыўся ў тым баі і наш аднавяскоўвец, вайсковы трубач Зігмунд Спецыус, якога ўзнагародзілі Георгіеўскім крыжом.

У міжваенны час Бучаны знаходзіліся пад уладай Польшчы, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны былі захоплены фашыстамі. Непадалёк ад вёскі ёсць месца, дзе былі спалены за дапамогу партызанам мясцовыя жыхары. Вызвалены былі Бучаны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў увосень 1942 года.

Няпроста было пасля вайны аднавіць вёску. Сваімі намаганнямі вяскоўцы ўжо ў першыя пасляваенныя гады пабудавалі школу, бібліятэку, клуб, краму і капліцу.

Сёння ў Бучанах пражывае ўсяго каля 20 жыхароў, большасць якіх сталага ўзросту. Міне час, і, на жаль, знікне мая любая вёсачка. Але я спадзяюся, што памяць пра яе захаваецца на доўгія гады.

**Вікторыя ГІР'ЯТОВІЧ,**
**студэнтка 1 курса ФлФ.**

# СУСТРЭЧА З ВЯДОМЫМ ГІСТОРЫКАМ

Нядаўна на гістарычным факультэце адбылася сустрэча з вядомым беларускім гісторыкам, дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ, адным з аўтараў вучэбнага дапаможніка для 9-га класа агульнаадукацыйнай школы Уладзімірам Аркадзьевічам Соснам. Мерапрыемства было арганізавана навукова-даследчым аб'яднаннем студэнтаў ГФ «Краязнавец». У.А. Сосна распавёў пра свой шлях у навуку, праблемныя пытанні гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст.

Уладзімір Аркадзьевіч нарадзіўся 30 лістапада 1951 года ў вёсцы Галяшонкі Смаргонскага раёна ў настаўніцкай сям'і. Цікавасць да гісторыі яму прывіў школьны настаўнік. Ды ці магло быць па-іншаму, калі ўлічыць, што У.А. Сосна пражываў непадалёку ад Крэўскага замка, дзе вяршыліся гістарычныя лёсы ўсёй краіны.

Паспяхова скончыўшы гістарычны факультэт БДУ ў 1973 годзе, Уладзімір Аркадзьевіч па размеркаванні быў накіраваны ў Мядзельскую сярэднюю школу. Там ён працаваў настаўнікам сусветнай гісторыі, але марыў выкладаць гісторыю Беларусі. На жаль, на гэты прадмет школьнай праграмай тады прадугледжвалася няшмат гадзін. Вывучаць жа і выкладаць гісторыю Беларусі можна было на гістарычным факультэце. А для гэтага неабходна было скончыць аспірантуру.


**На здымку: У.А. Сосна і М.В. Півавар падчас сустрэчы.**

Па рэкамендацыі загадчыка кафедры гісторыі БССР БДУ Лаўрэнція Сямёнавіча Абэцэдарскага У.А. Сосна стаў лабарантам, а праз нейкі час і аспірантам кафедры. У 1983 годзе ён абараніў кандыдацкую дысертацыю «Фарміраванне саслоўя дзяржаўных сялян на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.».

Уладзімір Аркадзьевіч працаваў спачатку выкладчыкам гісторыі ў Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі, затым – у БДУ, Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы. Сярод соцень і тысяч студэнтаў, якія вучыліся ў яго, ёсць і тыя, хто абраў шлях вучонага-гісторыка. У.А. Сосна падрыхтаваў трох кандыдатаў гістарычных навук.


**На здымку: студэнты-гісторыкі падчас сустрэчы.**

Працуючы ва ўстановах вышэйшай адукацыі, немагчыма не займацца навуковай дзейнасцю. Асноўныя тэмы, над якімі працуе даследчык, – сялянскае пытанне і палітычнае жыццё на беларускіх землях у апошняй трэці XVIII – першай палове XIX ст. Вынікам амаль пяцідзесяцігадовай працы Уладзіміра Аркадзьевіча стала больш за 200 прац: манаграфій, артыкулаў, вучэбных дапаможнікаў. Асаблівым гонарам для навукоўца з'яўляецца праца над дапаможнікам па гісторыі Беларусі, па якім сёння навучаюцца школьнікі.

Падчас выступу добрым словам У.А. Сосна прыгадаў свайго настаўніка Л.С. Абэцэдарскага. Шмат хто лічыць яго галоўным стваральнікам савецкіх міфаў па гісторыі Беларусі. Выкладчык удакладніў: Абэцэдарскі быў таленавітым гісторыкам, неардынарнай асобай і адначасова чалавекам свайго складанага часу, не стваральнікам міфаў, а ўмелым іх распаўсюджвальнікам. Прыгадаў навуковец добрым словам і Міколу Іванавіча Ермаловіча. Яго ідэі, даследчыцкая праца і папулярызатарская дзейнасць зрабілі значны ўнёсак у адраджэнне гістарычнай свядомасці беларусаў, выклікалі навуковую дыскусію па праблеме ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага. Уладзімір Аркадзьевіч у маладосці неаднаразова бачыў і слухаў у электрычцы М.І. Ермаловіча, які накіроўваўся ў бібліятэку і распавядаў сваім спадарожнікам пра сапраўдную гісторыю Беларусі.

Сярод цікавых пытанняў, якія задавалі студэнты і на якія адказваў выкладчык, былі наступныя: у якім Віцебску жылося лепш: 1771-га ці 1773-га года? Наколькі складана пісаць падручнік? На што разлічвалі паўстанцы К. Каліноўскага і інш.

На жаль, часу адказаць на ўсе пытанні не хапіла. Таму спадзяёмся на новую сустрэчу з таленавітым беларускім гісторыкам.

**Мікалай ПІВАВАР,**
**кандыдат гістарычных навук,**
**дацэнт кафедры гісторыі Беларусі.**
**Фота Аляксандра Машэўскага.**

# БАГАТАЯ ВІЦЕБСКАЯ ЗЯМЛЯ НА ГЕНЕРАЛАЎ



Вывучэнню гісторыі роднага краю ў Віцебскім кадэцкім вучылішчы надаецца асаблівая ўвага. Сёння я хачу расказаць пра генеральскія дынастыі XIX ст., якія паходзяць з Віцебшчыны. Як аказалася, такіх дынастый некалькі: Гуркі-Рамейкі, Лявіцкія, Радкевічы, Кайгародавы, Цвяцінскія.

Самай паважанай была сям'я Гуркаў (Рамейкаў-Гуркаў). З гэтага роду выйшла сем генералаў. Родапачынальнікам жа яго лічыцца Гурка (Гурый) Аляхновіч Рамейка, які ў 1539 годзе быў смаленскім намеснікам.

Найбольш вядомым военачальнікам гэтага роду можна лічыць рускага генерал-фельдмаршала Іосіфа Уладзіміравіча Гурку (1828–1901).

Нарадзіўся І.У. Гурка ў мястэчку Крынкі Аршанскага павета (цяпер Лёзненскі раён). Скончыў Пажаскі корпус, удзельнічаў у Крымскай (1853–1856) і руска-турэцкай (1877–1878) войнах. На чале рускіх і балгарскіх войскаў вызваліў горад Тырнава, захапіў турэцкія ўмацаванні Горны Дубняк і Тэліш, акружыў Плеўну. А ў снежні 1877 года 70-тысячны атрад рускіх войскаў пад яго кіраўніцтвам пераадолеў Балканы і, здзейсніўшы беспрэцэдэнтны пераход у трыццаціградусны мароз праз цяжкадаступны Чур'янскі перавал, вызваліў Сафію. Потым разбіў турэцкія войскі каля Філіпаполя (Пловдзіў) і выйшаў да Сан-Стэфана, дзе і была падпісана мірная дамова.

Пасля вайны Іосіф Уладзіміравіч Гурка выконваў абавязкі памочніка галоўнакамандуючага войскамі гвардыі і Санкт-Пецярбургскай ваеннай акругі, быў часовым генерал-губернатарам Пецярбурга, Адэсы, генерал-губернатарам Прывіслінскага краю і Варшавы, служыў камандуючым войскамі Адэскай ваеннай акругі, камандуючым войскамі Варшаўскай ваеннай акругі. Даслужыўся да чыну генерал-фельдмаршала.

У Іосіфа Уладзіміравіча было шэсць сыноў. Адзін з іх – Аляксей – памёр у раннім дзяцінстве, другі – Яўген – загінуў на дуэлі ў 25 гадоў. Нешчаслівы лёс быў і ў сына Мікалая, які скончыў жыццё самагубствам. Ён прайграў у карты вялікую суму грошай і, каб выплаціць доўг, спрабаваў абабраць багатага купца, але быў арыштаваны. На сямейным савеце было вырашана, што дапусціць суда і зняслаўлення старажытнага роду нельга, таму існуе меркаванне, што бацька сам занёс сыну атруту.

У памяць пра Іосіфа Гурку названы адзін з самых вялікіх бульвараў Сафіі (Балгарыя), вуліцы ў шматлікіх гарадах і нават тры населеныя пункты: горад Гуркава і два сялы Гуркава. У 2013 годзе ў Сафіі генерал-фельдмаршалу таксама быў усталяваны помнік.

У нас жа, на Віцебшчыне, а дакладней у вёсцы Крынкі Лёзненскага раёна, якой у свой час валодаў дзядзька фельдмаршала генерал-маёр Лявонцій (Леапольд) Гурка (1783–1861), захавалася шмат збудаванняў сямейнай сядзібы дарэвалюцыйнага часу. Гэта гаспадарчыя пабудовы, найперш канюшні і манеж для выгулу коней, а таксама сажалкі. Аднак ніякіх звестак пра тое, што вёска з'яўляецца радзімай выдатнага роду ваенных і генерал-фельдмаршала, няма. Адсутнічаюць матэрыялы пра славутага земляка і ў школьных літаратурных музеях: музеі М. Лынькова і музеі баявой славы.

Дарэчы, Крынкі належалі роду Гуркаў здаўна. Каля сажалкі стаяла мураваная каталіцкая капліца, узведзеная ў візантыйскім стылі, якая належала Бабінавіцкай парафіі. Час пабудовы яе дакладна не вызначаны, але вядома, што ў 1855 годзе архібіскуп Галавінскі дазволіў праводзіць у ёй набажэнствы. У капліцы знаходзіліся пахаванні падкаморыя Віцебскага ваяводства Іосіфа (Юзэфа) Рамейкі-Гуркі; падпаручніка пяцігорскага, губернатара Іосіфа Рамейкі-Гуркі; генерала ад інфантэрыі Расійскай імператарскай арміі Уладзіміра Гуркі; генерал-фельдмаршала Іосіфа Гуркі; генерал-маёра Леапольда Рамейкі-Гуркі. На магіле Уладзіміра Гуркі быў узведзены помнік – крыж з белага мармуру з надпісам на польскай і рускай мовах.

Лічу што, мэтазгодна было б зрабіць на ўездзе ў Лёзна і Крынкі інфармацыйныя знакі «Лёзненшчына – радзіма герояў» і «Крынкі – радзіма герояў», якія б утрымлівалі звесткі пра славутых землякоў, а ў Крынках, на месцы капліцы і былых пахаванняў роду Гуркаў, паставіць мемарыяльны крыж і інфармацыйную шыльду пра значэнне роду Гуркаў-Рамейкаў у гісторыі Лёзненшчыны, Беларусі, Расіі і ўсходніх славян.

**Вячаслаў БАЧЫНСКІ,**
**віцэ-кадэт Віцебскага кадэцкага вучылішча.**

**На здымку:** конны манеж.


МЫ і ЧАС
ГАЗЕТА БДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА

# ЗРУЙНАВАНАЯ СВЯТЫНЯ



Непадалёку ад Віцебска на беразе возера Вымна стаяў Тадулінскі Свята-Успенскі манастыр. А ў ім захоўвалася цудадзейная ікона Тадулінскай Божай Маці. Шмат людзей яна выратавала ад розных хвароб, але пакланіцца іконе мог толькі чалавек з чыстай душой і глыбокай верай.

Тадулінскі манастыр – адна са старадаўніх хрысціянскіх святыняў Беларусі. Заснаваны ён быў як каталіцкі ў 1743 годзе троцкім ваяводам Тадэвушам Агінскім. Спачатку манастыр быў уніяцкім і належыў базыльянскаму ордэну. З 1842 года ён стаў праваслаўным, тут пражывалі манахі, якія былі пераведзены сюды з віцебскага Успенскага базыльянскага манастыра.

Тадулінскі манастыр быў вельмі багаты, аднак з цягам часу гаспадарка яго прыйшла ў заняпад. Адраджэнне святыні пачалося 20 лістапада 1888 года, калі Свяшчэнным Сінодам было вырашана ператварыць манастыр з мужчынскага ў жаночы. Мужчыны ж, якія пражывалі тут да гэтага часу, былі пераведзены ў полацкі Богаяўленскі і віцебскі Маркаў манастыры. На пачатку XX стагоддзя ў Тадулінскім манастыры пражывала больш за 50 манашак, пры ім былі адчынены двухкласнае жаночае вучылішча і ўзорная школа.

Тадулінскі Свята-Успенскі манастыр валодаў значнымі зямельнымі ўгоддзямі і вялікай бібліятэкай, у якой захоўваліся кнігі на лацінскай, французскай, польскай і рускай мовах, больш за тысячу сачыненняў, а таксама Прывілей караля Аўгуста III. Убранне храма складалі абразы, царкоўныя рэчы, пакрытыя каштоўнымі металамі.

Галоўнымі манастырскімі святынямі былі дзве іконы – ікона Свяціцеля Цудатворца Мікалая і ікона Прасвятой Божай Маці Тадулінскай. Апошняя напісана ў 1743 годзе. На іконе – выява Божай Маці ў кароне, якая левай рукой трымае Ісуса. Вакол – 34 выявы зямнога жыцця Багародзіцы. Унізе – надпіс на лацінскай мове: «S. Maria Tadulinensin, Miraculis Clarissimein Palatinatu Vitebscen Si» («Святая Марыя Тадулінская, услаўленая цудамі на землях віцебскіх»).

Пасля закрыцця манастыра лёс іконы невядомы. Але да нашых дзён захаваліся легенды пра яе. Адну з іх я пачула ад настаўніцы, калі вучылася ў школе:

«У даўнія часы жыла ў вёсцы Тадуліна звычайная сялянская сям'я, і была ў іх добрая і прыгожая дачка Марыля. Цяжкі лёс напаткаў гэтую сям'ю: нарадзілася Марыля сляпой. Бацькі шкадавалі яе, не ведалі, як дагадзіць, каб развесяліць сумную прыгажуню дачку...

Нічога яе не радавала: ні музыка, ні спевы. І вось аднойчы завітаў у гэтую сялянскую хату старац. Маці пачаставала яго хлебам і распавяла пра тое, што не на свята ён трапіў...

Гледзячы на Марылю, старац сказаў: "Душа ў цябе добрая, а добраму чалавеку заўсёды паратунак знойдзецца". І прапанаваў ён разам пайсці ў Тадулінскі манастыр. Бацькі адпусцілі дзяўчыну, і яна са старцам адправілася ў дарогу.

Тыдзень малілася дзяўчына перад іконай Тадулінскай Божай Маці. І вось аднойчы надвячоркам заззяў незвычайным святлом лік Багародзіцы і ціхі пранікнёны голас прамовіў: "Ідзі і глядзі". І здарыўся цуд: Марыля расплюшчыла вочы і праз акно келлі ўбачыла блакітнае неба і незвычайна прыгожы захад сонца. Узрадаваная, яна сказала: "Дзякуй табе, Усявышні, за гэты цуд. І калі я пераступіла парог святыні і атрымала збаўленне ад хваробы, то тут навечна і застануся"».

Як і многіх хрысціянскіх святыняў, лёс Тадулінскага манастыра быў незайздросным. У гады Вялікай Айчыннай вайны яго ўзарвалі нямецкія салдаты. Храм быў разбураны, уцалела толькі частка падвальных памяшканняў. Існуе легенда, што адно з іх мае ход пад возера.

4 красавіка 2011 года Сінод Беларускай праваслаўнай царквы прыняў рашэнне аб аднаўленні манастыра. Настаяцельніцай яго прызначана манахіня Іларыя. На манастырскім узгорку пабудавана капліца. А гэта значыць, што святыня адраджаецца...

**Ірына ДАНІЛАВА, студэнтка 1 курса ФлФ.**

**УВАГА, КОНКУРС!**

# ПРА ЦЯБЕ, РОДНАЯ ЗЯМЛЯ

З 22 лютага па 16 мая 2016 года ў нашым універсітэце праходзіць штогадовы конкурс краязнаўчых работ «Землі родимой уголок». У конкурсе, які, дарэчы, будзе праводзіцца ўжо ў сёмы раз, могуць прыняць удзел студэнты ўсіх факультэтаў дзённай формы навучання нашай ВНУ. Для гэтага трэба падрыхтаваць цікавую аўтарскую работу пра культурную спадчыну Беларусі: гісторыю канкрэтнага помніка, пэўную культурную падзею, вядомага дзеяча мастацтва, культуры ці навукі.

Праект можа быць выкананы ў розных жанрах і тэхніках. Гэта могуць быць як творы мастацтва, так і фотаздымкі, відэаролікі, прэзентацыі ці праекты, прысвечаныя матэрыяльнай і духоўнай спадчыне Беларусі. Вітаецца выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Вынікі краязнаўчага конкурсу кампетэнтнае журы падвядзе да 25 мая. Аўтары трох лепшых работ атрымаюць спецыяльныя дыпломы і прызы. Конкурс праводзіць аддзел па выхаваўчай рабоце з моладдзю. Куратар конкурсу – метадыст В.У. Пуцеева.

Запрашаем усіх прыняць удзел у конкурсе!

# КРАЯЗНАВЕЦ, У ЯКОГА НЯМА АДПАЧЫНКУ

На пачатку сакавіка цікавая сустрэча адбылася на гістарычным факультэце. Да студэнтаў-гісторыкаў першага курса завітаў настаўнік з Міёршчыны, апантаны краязнавец Вітольд Антонавіч Ермалёнак.

Вітольд Антонавіч ужо больш за сорак год працуе настаўнікам гісторыі ў Міёрскай сярэдняй школе № 3. Прычым ён не проста выкладае прадмет, але і сур'ёзна займаецца краязнаўчай працай. Пад кіраўніцтвам Вітольда Ермалёнка пры школе працуе краязнаўчы гурток «Арганаўты мінулага», у склад якога ўваходзяць вучні, што неабыякава ставяцца да гісторыі роднага краю. Разам са школьнікамі Вітольд Антонавіч ладзіць пешыя і велапаходы па Віцебскім рэгіёне, збірае цікавыя легенды і паданні, адшуквае ўнікальныя экспанаты для аднаго з трох музеяў, створаных настаўнікам.

Дзякуючы Вітольду Антонавічу пры школе працуе гістарычны музей (адкрыты ў 1986 годзе), музей кнігі і друку (2006) і этнаграфічны музей «Сялянская хата» (2015). У хуткім часе краязнавец плануе адкрыць музей асветы.

Фонды трох музеяў налічваюць больш за 30 тысяч самабытных экспанатаў, у кожнага з якіх свая гісторыя.

«Я заўсёды раю сваім вучням уважліва глядзець пад ногі, а не ўгару, – адзначыў падчас сустрэчы Вітольд Ермалёнак, – бо ніколі не ведаеш, што табе можа патрапіцца на шляху».

І гэта сапраўды так. Напрыклад, рымскую манету 280 г. н.э. Вітольд Антонавіч знайшоў на асфальце, калі чакаў на прыпынку аўтобус. Хутчэй за ўсё яна была «прынесена» з поля адным з камбайнаў, якія ў той час па шашы вярталіся на базу.



Знаходка такога кшталту манет на тэрыторыі Беларусі ў чарговы раз даказвае, што, дзякуючы шляху «з варагаў у грэкі», часткай якога з'яўлялася і наша Заходняя Дзвіна, мы мелі гандлёвыя зносіны з краінамі Еўропы.

Зразумела, што не ўсе экспанаты музеяў былі знойдзены вось так выпадкова. Адны настаўнік набываў за грошы, другія ж зарабляў сваім потам і крывёй. Напрыклад, за адны кнігі Вітольд Антонавіч амаль усё лета дапамагаў суседкам па гаспадарцы: абкошваў пожні, пераворваў агарод, сек дровы. А калі тыя прапаноўвалі разлічыцца за працу самагонкай – адмаўляўся, маўляў, дайце лепш за працу кнігі (краязнавец ведаў, што ў суседскай сям'і захоўваліся рэдкія выданні).

А за некаторую літаратуру, якая сёння экспануецца ў школьным музеі кнігі і друку, Вітольд Ермалёнак наогул заплаціў крывёю:

«Аднойчы, вяртаючыся ў Міёры з Друі, я стаяў на прыпынку і чакаў аўтобуса, як заўважыў, што на адным з падвор'яў нейкі дзед расклаў цэлае вогнішча са старых кніг і ўсё падкідваў ды падкідваў новыя, – распавядаў студэнтам Вітольд Антонавіч. – Часу раздумваць не было, я кінуўся ў агонь і голымі рукамі пачаў выцягваць кнігі. Згарэлі рукавы кашулі, палопалася скура на руках, і пачалі крывавіць апёкі. Аднак я не спыніўся». Тады Вітольду Ермалёнку ўдалося выратаваць з агню некалькі цікавых выданняў, у тым ліку кнігі Адлера – аптэкара з Друі.

Сваю зацікаўленасць да краязнаўства і апантанасць гісторыяй роднага краю Вітольд Антонавіч прывіў і вучням. Пра гэта можа сведчыць, напрыклад, выпадак, расказаны Вітольдам Антонавічам:

«Аднойчы мой былы вучань, які служыў у арміі, бег марафон з поўнай выкладкай. І раптам убачыў пад нагамі нейкую рэч (як аказалася потым, гэта была старажытная прылада працы), спыніўся і, пакуль акуратна не раскапаў яе сапёрскай рыдлёўкай, далей не пабег».

Расказваў Вітольд Антонавіч гісторыкам і іншыя цікавыя выпадкі са свайго жыцця. Як аказалася, В.А. Ермалёнак ведае свой радавод да 20 калена: памяць аб продках у яго сям'і перадаецца з пакалення ў пакаленне, ад бацькі да сына.

З будучымі настаўнікамі гісторыі госць з Міёршчыны падзяліўся сакрэтамі педагагічнага майстэрства, расказаў, як наладзіць кантакт з вучнямі, зацікавіць іх гісторыяй і краязнаўствам. Студэнты-гісторыкі былі ў захапленні ад госця, з ахвотай задавалі яму пытанні, прасілі сфатаграфавацца.

«Памятайце, – сказаў напрыканцы сустрэчы Вітольд Ермалёнак студэнтам, – краязнаўцы не ходзяць у адпачынак. Калі вы абралі гэтую прафесію, то яна павінна стаць вашым жыццём».

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

# БУДУЩИЕ ЭКСКУРСОВОДЫ НА ПРАКТИКЕ

В подготовке учащихся к будущей трудовой деятельности особое место отводится практике. Так, к примеру, в учебной программе учащихся специальности «Туризм и гостеприимство» предусмотрена технологическая практика в музеях Республики Беларусь. И этот год не стал исключением.





Юноши и девушки под руководством опытных преподавателей колледжа Веры Андреевны Алексеенко, Надежды Ильиничны Жавнерко и Александры Александровны Кабылковой проходили практику в трех музеях Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника: Музее традиционного ручного ткачества Поозерья, Художественной галерее, Природно-экологическом музее. Курировали учащихся со стороны учреждений культуры заведующие филиалами: Ольга Фёдоровна Дамаскина, Лариса Михайловна Лысенко и Валерий Александрович Ледник.

А в первые дни весны прошли зачетные экскурсии, которые посетили учащиеся групп 22Т, 32Т и 31В колледжа. Почетными гостями мероприятия стали выпускники специальности «Туризм и гостеприимство» Татьяна Ахрамович и Ольга Стацевич, а также заместитель директора по учебно-производственной работе Снежана Булах.

Молодые экскурсоводы немного волновались, и это неудивительно, ведь они хотели как можно интереснее и доступнее преподнести материал. К счастью, волнение не помешало им хорошо провести экскурсию и продемонстрировать отличные знания и высокий уровень подготовки.

**Н.И. ЖАВНЕРКО, преподаватель, руководитель технологической практики Полоцкого колледжа, магистр педагогических наук.**

## НА ХВАЛІ ТВОРЧАСЦІ

# «ВЯСНА ПІША ВЕРШЫ КВЕТКАМІ»



Напярэдадні свята 8 Сакавіка ў народным літаратурным музеі ўніверсітэта адбылося адкрыццё фотавыставы кандыдата біялагічных навук, дацэнта, загадчыка кафедры батанікі Леанарда Міхайлавіча Мяржвінскага «Вясна піша вершы кветкамі». На ёй прысутнічалі студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта.

Як расказаў Леанард Міхайлавіч, з дзяцінства яго ўражвала прыгажосць роднага краю. Любіў ён і біялогію, заўсёды з задавальненнем па некалькі разоў перачытваў у газетах і часопісах артыкулы, прысвечаныя свету раслін і жывёл.

Захапленне кветкамі пачалося яшчэ ў школьныя гады. Аўтар выставы ўспамінае, што падчас вучобы ў яго была самая вялікая ў вёсцы калекцыя цюльпанаў, у дзясятым класе яна папоўнілася адзінаццацю гатункамі руж. Вырошчваў іх Л.М. Мяржвінскі не толькі для сябе. Палюбавацца кветкамі прыходзілі з усёй вёскі. А са з'яўленнем першага фотаапарата прыгажосць кветак Леанард Міхайлавіч адлюстроўваў у сваіх фотаработах.

Прымула, пралескі, сныць, сон-трава, гіяцынты... Усе кветкі, прадстаўленыя на выставе (а іх налічваецца каля двух дзясяткаў), можна вырошчваць самім, галоўнае – жаданне. Некаторыя з іх выкладчык выкарыстоўвае пры заваранні гарбаты, у кулінарыі. Так, з мядзведжай цыбулі можна прыгатаваць вельмі смачны салат.

Кветкі заўсёды ідуць побач з паэзіяй, таму студэнты пятага курса падрыхтавалі вершы беларускіх пісьменнікаў. Свае ўласныя творы прадставілі дацэнт кафедры літаратуры Вольга Іванаўна Русілка і арганізатар выставы, старшы выкладчык гэтай жа кафедры Ірына Вацлаваўна Саматой.

Госці літаратурнага музея ў гэты дзень змаглі не толькі палюбавацца прыгажосцю кветак, але і пачаставацца знакамітай гарбатай – «прываротным зеллем» ад траўніка Леанарда.

**Юлія ГАЎРЫЛЕНКА, студэнтка 5 курса ФлФ. Фота аўтара.**

# ЛІТАРАТУРНАЯ МАСЛЕНІЦА АЛЕНЫ МАСЛА



Не так даўно ў народным літаратурным музеі адбылася сустрэча з вядомай беларускай пісьменніцай-казачніцай Аленай Масла.

Студэнты з захапленнем і цікавасцю слухалі Алену Сцяпанаўну. Аўтарка распавядала пра дзіцячую беларускую літаратуру, ролю казкі ў жыцці кожнага чалавека, а таксама пра гісторыю сучаснай беларускай казкі.

Госця правяла таксама казачную віктарыну, а яе пераможцам уручыла прызы. Алена Сцяпанаўна з задавальненнем адказала на пытанні студэнтаў, а тым, хто спрабуе сябе ў літаратуры, параіла дасылаць свае творы ў часопісы і газеты.

Падчас сустрэчы Алена Масла прэзентавала сваю казку «Мяне завуць Лахнэска», якую студэнты слухалі з вялікім захапленнем і ўвагай. Напрыканцы ўдзельнікі разам з госцяй сфатаграфаваліся на памяць.

**Крысціна ДАЙЛІДЗЁНАК, студэнтка 1 курса ФлФ.**

# ВЫПРАБАВАННЕ РЭАЛЬНАСЦЮ Ў КНІГАХ ФРАНЦА СІЎКО



*Фэнтэзі, трылер, драма – жанры, якія найбольш цікавяць сучаснага чытача. Несумненна, многім падабаюцца кнігі пра незвычайныя, фантастычныя здарэнні ці дэтэктыўныя расследаванні. Але ёсць тэмы, якія незалежна ад часу кранаюць сэрцы людзей. Адной з такіх з'яўляецца жыццё простага чалавека. Добра разумеючы людзей, перажываючы разам з імі іх складаны лёс, вядомы віцебскі празаік бярэ рэальныя жыццёвыя гісторыі за аснову сваіх твораў.*

*Франц Сіўко нарадзіўся на Віцебшчыне, у вёсцы Вята Міёрскага раёна. Атрымаўшы адукацыю на філалагічным факультэце БДУ, больш за дваццаць год працаваў настаўнікам і выкладчыкам у розных навучальных установах. Акрамя выкладчыцкай дзейнасці Франц Сіўко прысвячаў сябе і грамадскай справе: з'яўляўся ўласным карэспандэнтам каталіцкага часопіса «Ave Maria», сябрам рады Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Віцебшчыны, старшынёй Віцебскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў.*

*Літаратурная спадчына празаіка складаецца з дзесяці кніг, апошняя з якіх – «Плебейскія гульні». Прэзентацыя гэтай кнігі не так даўно адбылася на гістарычным факультэце нашага ўніверсітэта, а таксама ў бібліятэках горада. Пасля адной з такіх сустрэч мне пашчасціла пагутарыць з Францам Сіўко.*

**– Франц Іванавіч, скажыце, калі ласка, што натхніла Вас на напісанне кнігі «Плебейскія гульні»?**

– Гэта не быў нейкі разавы, імгненны парыў. Усе тры змешчаныя ў зборніку аповесці пісаліся ў розны час, у розных абставінах. Але, як і ў любога літаратара, у кожнай з іх знайшлі адбітак погляды аўтара на сучаснае жыццё. Наогул, натхненне – рэч непрадказальная, таму і адказваць на падобнае пытанне няпроста. Як канкрэтызаваць з'яву, распыленую ў часе і прасторы, калі яна яшчэ да таго і абцяжараная нейкімі аб'ектыўнымі (ды і суб'ектыўнымі) акалічнасцямі?

**– Якім тэмам у сваёй творчасці Вы аддаяце перавагу?**

– Мяне цікавяць тэмы, звязаныя з трансфармацыяй характару і ўчынкаў чалавека ў так званых «слізкіх», складаных сітуацыях. Напрыклад, тэма аддanасці ці, наадварот, здрады. Тэма помсты і даравання. У эсэістыцы – тэма факталагічнага адлюстравання рэчаіснасці.

**– Усе Вашыя творы захапляльныя і павучальныя. Як Вы лічыце, які з іх найбольш уздзейнічае на светапогляд сучаснай моладзі?**

– Напэўна, прыпавесць «Удог». Але гэта, канечне, справа густу.

**– Цікава, літаратурная спадчына якога пісьменніка паўплывала на Вашае станаўленне як творцы?**

– На творчы почырк пісьменніка ў пэўнай ступені ўсё прачытанае ўплывае – і ўдалае, і не надта ўдалае. Усё – глеба, усё – грунт для асэнсавання. Пералік аўтараў, якімі я захапляўся ў розныя часы, занадта доўгі, каб яго прыводзіць цалкам. Гэта і Чорны, і Чэхаў, і Вальтэр, і Фолкнер, і Джойс, і Камю... Але важна не толькі браць, а і, беручы, заставацца сабою. Гэта, можа, самае галоўнае.

**– Сёння Вашыя кнігі запатрабаваныя чытацкай аўдыторыяй. Скажыце, над чым працуеце зараз? Каму ці чаму будзе прысвечаны Ваш новы твор?**

– Гэта будзе дапрацаванае перавыданне кніжкі «Выспы». Цяпер я працую над ілюстрацыямі, што будуць змешчаны ў ёй, – здымкамі маіх родных мясцін і блізкіх людзей.

**– Дзякую за цікавую размову, жадаю творчых поспехаў і віншую з выхадам новай кнігі.**

**Іна ШЫРКЕВІЧ, студэнтка 2 курса ФлФ.**


**Учреждение образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова» объявляет конкурс на замещение должности старшего преподавателя кафедры дошкольного и начального образования – 1,0.**

**Срок подачи заявлений – один месяц со дня опубликования объявления.**

**Наш адрес: г. Витебск, пр-т Московский, д. 33, отдел кадров.**

**Тел. 58-58-56.**


## КАК ЖИВЕШЬ, КОЛЛЕДЖ?

# ВЕСНА ИДЕТ! ВЕСНЕ ДОРОГУ!



В этом году Международный женский день в Полоцком колледже ВГУ имени П.М. Машерова превратился в настоящий весенний калейдоскоп. Празднику была посвящена целая неделя, во время которой девушек-учащихся, преподавателей и сотрудниц колледжа ждали поздравления, улыбки, цветы и, конечно, сюрпризы.

Особое волнение в эти дни ощущали юноши колледжа. Ведь им предстояла непростая задача – подготовиться к мероприятию, хорошенько все отрепетировать, выбрать и подарить дамам самые красивые цветы, а в ответ получить улыбки любимых преподавателей, девушек и родителей, которые пришли в этот день в колледж.

Яркой страничкой праздничного калейдоскопа стало выступление оркестра «Ренессанс-4» (руководитель В.Н. Ушак). Композицию «Мама» участники оркестра исполнили вместе с юными солистами Сергеем Кабиком (средняя школа № 2) и Викторией Стомой (средняя школа № 16). Настоящим сюрпризом для всех стали видеоподарки от учащихся, проходящих педагогическую практику в учреждениях образования Витебской области, и их юных воспитанников.

Весна – пора приятных обновлений. В этом убедились все участники праздничного весеннего калейдоскопа во время выступления учащихся группы 22И и детского образцового театра моды «Топ-топ». Под руководством режиссера-постановщика Оксаны Петкевич творческий коллектив представил дефиле эксклюзивной дизайнерской одежды «Rada Style». Участники шоу продемонстрировали, как стильно могут выглядеть современные педагоги. Дизайнерское пальто от Виктории Потульской, строгие костюмы, элегантные платья – каждый наряд заслуживал громких аплодисментов.

«Журчат ручьи, слепят лучи, и тает лед, и сердце тает...» – эти строки из знакомой всем с детства песни звучали в колледже во время концерта, а сердце таяло от доброты, тепла и радости. И верилось: весна идет, весне дорогу!

**Юлия СКОМОРОЩЕНКО, учащаяся Полоцкого колледжа. Фото М. Фролова.**

## ЮБИЛЯРЫ

# ПРИМИТЕ ПОЗДРАВЛЕНИЯ





В первый месяц весны свои юбилейные дни рождения празднуют сразу два представителя математического факультета нашего университета – Ю.В. Трубников и Л.П. Лабунова. Юрий Валентинович, доктор физико-математических наук, профессор, профессор кафедры геометрии и математического анализа, и сегодня преподает в вузе и передает свои знания студентам. Лариса Павловна, проработав на кафедре алгебры и методики преподавания математики долгое время, находится на заслуженном отдыхе, но многие могут увидеть ее на сцене в составе вокального ансамбля ветеранов педагогического труда «Лира».

Пользуясь случаем, весь коллектив математического факультета поздравляет юбиляров и желает им здоровья, долгих и счастливых лет в кругу родных и близких, счастья и удачи во всем.

«Мы восхищаемся вашей энергией, силой воли и интересом к жизни, умением радоваться каждому дню и наслаждаться каждым мгновением. В этот день и всегда мы отдаем дань искреннего уважения вашей мудрости и жизненному опыту, трудолюбию и жизнелюбию. Здоровья вам, радости, человеческого тепла и счастья!» – говорится в тексте поздравления.


МЫ і ЧАС

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі 27.10.2009 г. Рэг. № 747.

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя П.М. МАШЭРАВА»

Адрас рэдакцыі: 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33. Тэл. 58-97-92. Эл. пошта: gazeta@vsu.by
Газета надрукавана афсетным спосабам ва УПП «Віцебская абласная друкарня». ЛП 02330/116 ад 27.03.2014 г. Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, Віцебск, 210015.
Падпісана да друку 28.03.2016 г. у 16.30. Тыраж 1200. Аб'ём 1 друк. арк. Зак. 1839.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.
Газета выходзіць два разы на месяц.

Галоўны рэдактар І.М. ПРЫШЧЭПА

Рэдактар Н.П. ЛАЗЕБНАЯ